УДК 7.049.2(476)

# АНТИАЛКОГОЛЬНАЯ КАМПАНИЯ В БССР ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ 1980-х гг.

***А. А. ГУЖАЛОВСКИЙ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Изучается проведение кампании по борьбе с пьянством и алкоголизмом во второй половине 1980-х гг. в БССР. Отмечается, что употребление спиртных напитков являлось серьезной проблемой для белорусского общества, наносило вред здоровью населения. Рассматриваются законодательные инициативы и практические действия партии и правительства по ограничению самогоноварения и государственного оборота алкоголя. Анализируется деятельность Белорусского республиканского добровольного общества борьбы за трезвость, которое прилагало усилия по борьбе с пьянством и внедрению трезвого образа жизни. Указывается, что государственная антиалкогольная политика была противоречивой и не имела существенных положительных результатов. Введенные ограничения вызвали появление очередей в магазинах, потребление суррогатов алкоголя и рост самогоноварения.

***Ключевые слова:*** БССР; перестройка; государственная политика; антиалкогольная кампания; пьянство; самогоноварение.

**Образец цитирования:**
Гужалоўскі АА. Антыалкагольная кампанія ў БССР другой паловы 1980-х гг. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2025;3:5–15.
EDN: XZAKNT

**For citation:**
Huzhalouski AA. Anti-alcohol campaign in the Soviet Belarus in the second half of the 1980s. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2025;3:5–15. Belarusian.
EDN: XZAKNT

**Автор:**
***Александр Александрович Гужаловский*** – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета.

**Author:**
***Alexander A. Huzhalouski***, doctor of science (history), full professor; professor at the department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history.
*huzhalouski@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0002-9743-8724*

CC BY NC

# АНТЫАЛКАГОЛЬНАЯ КАМПАНІЯ Ў БССР ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 1980-х гг.

***А. А. ГУЖАЛОЎСКІ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Вывучаецца правядзенне кампаніі па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам у другой палове 1980-х гг. у БССР. Адзначаецца, што спажыванне спіртных напояў з'яўлялася сур'ёзнай праблемай для беларускага грамадства, наносіла шкоду здароўю насельніцтва. Разглядаюцца заканадаўчыя ініцыятывы і практычныя дзеянні партыі і ўрада па абмежаванні самагонаварэння і дзяржаўнага абароту алкаголю. Аналізуецца дзейнасць Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць, якое прыкладала намаганні па барацьбе з п'янствам і ўкараненні цвярозага ладу жыцця. Указваецца, што дзяржаўная антыалкагольная палітыка была супярэчлівай і не мела значных станоўчых вынікаў. Уведзеныя абмежаванні выклікалі з'яўленне чэрг у крамах, ужыванне сурагатаў алкаголю і рост самагонаварэння.

***Ключавыя словы:*** БССР; перабудова; дзяржаўная палітыка; антыалкагольная кампанія; п'янства; самагонаварэнне.

# ANTI-ALCOHOL CAMPAIGN IN THE SOVIET BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE 1980s

***A. A. HUZHALOUSKI***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The article examines the campaign against drunkenness and alcoholism in the second half of the 1980s in the Soviet Belarus. It notes that alcohol consumption was a serious problem for Belarusian society and was harmful to public health. Legislative initiatives and practical actions taken by the party and the government to restrict moonshining and the state circulation of alcohol are examined. The activities of the Belarusian Republican Voluntary Society for the Fight for Sobriety, which made efforts to combat drunkenness and promote a sober lifestyle, are analysed. It is pointed out that the state's anti-alcohol policy was contradictory and did not have any significant positive results. The restrictions introduced led to queues in shops, the consumption of alcohol substitutes and an increase in moonshining.

***Keywords:*** Soviet Belarus; perestroika; state policy; anti-alcohol campaign; drunkenness; moonshining.

## Уводзіны

У СССР антыалкагольныя кампаніі праводзіліся неаднаразова: у 1920-х, 1950-х і 1970-х гг. Іх арганізатары выкарыстоўвалі стандартныя метады. Яны абмяжоўвалі выраб алкагольных напояў, уздымалі іх кошт, забаранялі продаж гарэлкі паблізу ўстаноў адукацыі, прамысловых прадпрыемстваў і вакзалаў, а таксама вялі барацьбу за цвярозы лад жыцця і перавыхоўвалі п'яніц. Аднак усе кампаніі заканчваліся прыкладна аднолькава. Агітацыя цвярозасці зводзілася да сумных рытуальна-сімвалічных абмерканняў п'яніц на партыйных сходах. Расла падпольная вытворчасць самагону. Паклоннікі Бахуса перамяшчаліся з рэстаранаў, кафэ і буфетаў у двары, паркі і скверы. Акрамя таго, антыалкагольныя кампаніі наносілі шкоду эканоміцы, бо алкагольны артыкул даходаў у бюджэце СССР заўсёды быў адным з буйнейшых. У выніку дзяржава адмяняла забароны, а продаж спіртнога аднавілі яшчэ ў большым аб'ёме.

Антыалкагольная кампанія другой паловы 1980-х гг. з'яўляецца слаба вывучаным сюжэтам гістарыяграфіі гарбачоўскай перабудовы ў БССР. Сярод прац беларускіх гісторыкаў, якія даследавалі гэту праблему, трэба згадаць артыкул М. Б. Несцяровіча, у якім закрануты асобныя аспекты змагання з п'янствам у рэспубліцы падчас перабудовы [1]. А. Р. Баброва разгледзела дэмаграфічныя аспекты правядзення гарбачоўская антыалкагольнай кампаніі [2]. Новыя звесткі пра барацьбітоў за цвярозы лад жыцця ў другой палове 1980-х гг. змешчаны ў публікацыі Л. М. Крываноса [3]. Такім чынам, антыалкагольная кампанія ў БССР другой паловы 1980-х гг. пакуль не з'яўлялася аб'ектам самастойнага комплекснага вывучэння ў айчыннай гістарыяграфіі.

Мэта даследавання – вызначэнне напрамкаў, характара і вынікаў барацьбы з п'янствам і алкагалізмам, якая ажыццяўлялася кіраўніцтвам БССР і Беларускім рэспубліканскім добраахвотным таварыствам барацьбы за цвярозасць у другой палове 1980-х гг. Для рэалізацыі пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы: разгледзець прычыны, ход і сэнсавую накіраванасць антыалкагольнай кампаніі, прааналізаваць формы і метады, якія ўжываліся ў барацьбе з п'янствам, а таксама вызначыць прычыны згортвання антыалкагольнай кампаніі.

## «Полусухі» закон

Да канца перыяду развітога сацыялізму спажыванне алкагольных напояў у СССР дасягнула рэкорднага за ўсю гісторыю краіны ўзроўню. Сярэднестатыстычны дарослы мужчына выпіваў каля 100 бутэлек гарэлкі за год. Астатні алкаголь ужываўся ў выглядзе самагону, віна ці піва. Пашырыўся жаночы і падлеткавы алкагалізм. За год у медыцынскія выцвярэзнікі трапілі каля 9 млн чалавек. Штогод 1,5 млн савецкіх людзей паміралі з прычыны злоўжывання спіртнымі напоямі.

Для насельніцтва БССР праблема алкагалізацыі з'яўлялася настолькі ж балючай, як і для ўсяго савецкага грамадства. Паводле дадзеных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў СССР, у 1984 г. па паказчыку ўжывання абсалютнага алкаголю на душу насельніцтва гэта дзяржава займала сярод другіх савецкіх рэспублік чацвёртае месца: у Эстонскай ССР аб'ём выпітых спіртных напояў склаў 11,59 л; у Літоўскай ССР – 11,01; у Латвійскай ССР – 10,52; у БССР – 9,79; у РСФСР – 8,36; у Казахскай ССР – 7,79; ва Украінскай ССР – 6,20; у Кіргізскай ССР – 5,89; у Малдаўскай ССР – 5,68; у Армянскай ССР – 4,31; у Туркменскай ССР – 3,96; у Грузінскай ССР – 3,87; ва Узбекскай ССР – 3,59; у Таджыкскай ССР – 2,34; у Азербайджанскай ССР – 2,29 л[1].

У партыйнае кіраўніцтва, урад, сродкі масавай інфармацыі ішоў паток лістоў грамадзян з патрабаваннем прыняць тэрміновыя меры супраць распаўсюджвання алкаголю. Непакой выклікалі не толькі абсалютныя лічбы выпітага савецкімі людзьмі спіртнога, але і дынаміка названага працэсу, якая мела выразную тэндэнцыю да павелічэння. У 1975–1984 гг. у БССР спажыванне абсалютнага алкаголю на душу насельніцтва ўзрасло на 1,2 л. Неабходна адзначыць, што ў 1981–1985 гг. колькасць хворых, якія знаходзіліся на ўліку ў наркалагічных дыспансерах і аддзяленнях бальніц рэспублікі, павялічвалася ў сярэднім на 11,6 тыс. чалавек за год і ў канцы дадзенага перыяду склала 182,9 тыс. чалавек. Калі ў 1976 г. у БССР было 63 установы для лячэння хворых на алкагалізм, то ў 1985 г. налічвалася 203 такія ўстановы. Адпаведна, на працягу 1981–1985 гг. колькасць лекараў-нарколагаў у рэспубліцы павялічылася на 111 чалавек (амаль у два разы)[2].

Менш чым праз месяц пасля выбрання на пасаду генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова, а менавіта 5 красавіка 1985 г., адбылося пасяджэнне Палітбюро ЦК КПСС, на якім большасцю галасоў былі падтрыманы прапановы па ўдасканаленні заканадаўства, накіраванага на барацьбу з п'янствам. Так, 7 мая 1985 г. выйшла складзеная камісіяй пад кіраўніцтвам М. С. Саломенцава шырокавядомая пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленні п'янства і алкагалізму». У той жа дзень была зацверджана пастанова Савета Міністраў СССР «Аб мерах па пераадоленні п'янства і алкагалізму, выкараненні самагонаварэння». Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР падпісаў адпаведны ўказ 16 мая 1985 г. На наступны дзень названыя вышэй дырэктыўныя дакументы былі апублікаваны ва ўсесаюзнай газеце «Правда»[3]. Іх прадубліравалі ЦК КПБ, Савет Міністраў БССР і Вярхоўны Савет БССР 23 жніўня, 7 чэрвеня і 20 мая 1985 г. адпаведна[4]. Пастановамі і ўказамі загадвалася скараціць вытворчасць усіх відаў алкагольнай прадукцыі, зменшыць колькасць кропак продажу алкаголю, абмежаваць час яго набыцця (з 14:00 да 19:00 асобам старэйшым за 21 год), весці жорсткую барацьбу з самагонаварэннем, строга забараніць спажыванне алкаголю ў грамадскіх месцах, а таксама актывізаваць працу выцвярэзнікаў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў (ЛПП) і наркалагічнай службы. Падчас правядзення кампаніі гэтыя захады былі дапоўнены павышэннем цэн на алкаголь і ўвядзеннем картачнай сістэмы на яго продаж. Акрамя таго, была ажыццёўлена выхаваўчая работа з насельніцтвам, у ходзе якой выкарыстоўвалася інфармацыя пра шкоду спіртнога і карысць цвярозасці.

У СССР антыалкагольная кампанія пачалася 1 чэрвеня 1985 г. Яе каардынацыяй у маштабах краіны займаўся адзін з ініцыятараў чарговай спробы выкаранення п'янства і алкагалізму сакратар ЦК КПСС па ідэалогіі Я. К. Лігачоў. У Мінску падобныя абавязкі былі даручаны сакратару ЦК КПБ па ідэалогіі Г. Г. Барташэвічу, які неадкладна прыняў да выканання новыя дырэктывы маскоўскага кіраўніцтва. Уся арганізацыйна-тэхнічная праца па ажыццяўленні партыйна-ўрадавых антыалкагольных пастаноў была ўскладзена на Камісію па барацьбе з п'янствам пры Савеце Міністраў БССР[5] на чале з намеснікам старшыні гэтага савета К. З. Церахам[6]. Яе пастановы былі абавязковымі для рэалізацыі ўсімі міністэрствамі,

[1]Нац. арх. Рэсп. Беларусь (НАРБ). Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1935. Арк. 97.

[2]Там жа. Спр. 608. Арк. 9–14.

[3]Постановление ЦК КПСС «О мерах по преодолению пьянства и алкоголизма» // Правда. 1985. 17 мая. С. 1 ; Постановление Совета Министров СССР «О мерах по преодолению пьянства и алкоголизма, искоренению самогоноварения» // Там же. С. 2 ; Указ Президиума Верховного Совета СССР «Об усилении борьбы с пьянством» // Там же.

[4]Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб мерах па ўзмацненні барацьбы супраць п'янства і алкагалізму, выкараненні самагонаварэння» // Збор законаў БССР, указаў Прэзідыума Вярхоўн. Савета БССР, пастаноў Савета Міністраў БССР. 1985. № 15. С. 231–238.

[5]Камісія па барацьбе з п'янствам створана Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 3 лістапада 1972 г. «Аб зацвярджэнні Палажэння аб камісіях па барацьбе з п'янствам».

[6]У 1987 г. К. З. Цераха на гэтай пасадзе змяніў намеснік старшыні Савета Міністраў БССР М. А. Макаед.

ведамствамі, а таксама выканкамамі мясцовых саветаў[7]. Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў Палажэнне аб камісіях па барацьбе з п'янствам, утвараемых на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях і іх структурных падраздзяленнях 14 лістапада 1985 г.[8]

Камісія па барацьбе з п'янствам пры Савеце Міністраў БССР распачала дзейнасць з узмацнення жорсткасці прававога ўздзеяння на аматараў алкагольных напояў. Так, калі ў маі 1985 г. органы ўнутраных спраў БССР выявілі 37,103 тыс. парушальнікаў антыалкагольнага заканадаўства, то ў чэрвені гэтага года – 46,785 тыс. чалавек. Большасць людзей, а менавіта 67 % чалавек, былі затрыманы за з'яўленне ў грамадскіх месцах у нецвярозым выглядзе, 8 % чалавек – за распіванне спіртнога ў неналежных месцах, 25 % чалавек – за дробнае хуліганства ў п'яным выглядзе, спекуляцыю алкаголем і самагонаварэнне. У чэрвені 1985 г. сума накладзеных штрафаў за гэтыя парушэнні раўнялась 511,7 тыс. руб. Быў узмоцнены кантроль за кіроўцамі транспартных сродкаў, у выніку чаго ў чэрвені таго ж года колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, здзейсненых па віне п'яных кіроўцаў, скарацілася на 32,9 %. Беларуская міліцыя, з якой за лета 1985 г. звольнілі за п'янства больш за 100 чалавек, пільна сачыла за выкананнем правіл гандлю спіртнымі напоямі[9].

У рэспубліцы былі закрыты шмат крам, якія прадавалі лікёра-гарэлачную прадукцыю. Да сярэдзіны 1985 г. колькасць такіх крам, падпарадкаваных Міністэрству гандлю БССР, скарацілася на 54,4 %, а колькасць крам, падпарадкаваных Беларускаму рэспубліканскаму саюзу спажывецкіх таварыстваў, – на 69,9 %[10]. Варта адзначыць, што да сярэдзіны 1986 г. у 25 тыс. населеных пунктаў БССР увогуле не гандлявалі спіртным[11]. Кошт гарэлкі прыкметна павялічыўся: калі да пачатку кампаніі бутэлька папулярнай «андропаўкі» каштавала 4 руб. 70 кап., то са жніўня 1986 г. найтаннейшая гарэлка абыходзілася ўжо ў 9 руб. 10 кап., а «андропаўка» знікла з прылаўкаў. Адпускалі па 1 бутэльцы на чалавека. На вяселле ці памінкі можна было ўзяць 10 бутэлек, але трэба было паказаць адпаведныя дакументы.

Гарэлка ўзбагаціла спіс вострадэфіцытных тавараў, яе неабходна было даставаць. Чэргі ў вінна-гарэлачныя крамы білі абсалютныя рэкорды: людзі займалі месцы за некалькі гадзін да адкрыцця. Падчас працы каля вінна-гарэлачных крам дзяжурылі супрацоўнікі міліцыі, іншы раз з-за цісканіны пацярпелым даводзілася выклікаць хуткую дапамогу. Для пабудовы чаргі і яе абароны ад пранікнення асабліва нахабных грамадзян, якія не жадалі чакаць, выкарыстоўвалі агароджы. Аднак часам і яны не вытрымлівалі націску «груп захопу», якія складаліся з некалькіх моцных мужчын, блакіраваўшых чаргу, пакуль адзін з іх браў патрэбную колькасць алкаголю. Вось як падобная чарга выглядала ў Брэсце, дзе за першыя два месяцы правядзення кампаніі мясцовая ўлада закрыла 120 кропак, на якіх гандлявалі спіртнымі напоямі: «Выходны, пяць гадзін дня… Чарга. Непраўдападобна доўгая чарга да вінна-гарэлачнай крамы на рагу вуліц Савецкай і Гогаля. Яна змяіцца па прыступках, спускаецца на асфальт і загінаецца за кут. У чарзе – мужчыны і жанчыны, спартыўнага выгляду юнакі і мажныя пенсіянеры. Бяруць гарэлку і "чарніла" оптам і ў розніцу, бяруць, каб раскаркаваць праз паўгадзіны, і запасаюцца пра запас… Цікаўлюся ў жанчыны, авоська якой набіта "Сталічнай": "Навошта так шмат гарэлкі? На дзень нараджэння? На вяселле?" – "Ды не, – прастадушна адказвае яна, – кажуць, што ў горадзе на днях уводзіцца сухі закон, вось і вырашыла прыхапіць пару бутэлечак на чорны дзень"»[12] (тут і далей пераклад наш. – *А. Г.*).

Людзі, затрыманыя ў п'яным выглядзе ў грамадскім месцы, мелі сур'ёзныя непрыемнасці на працы. За распіванне спіртнога на працоўным месцы або знаходжанне на ім у нецвярозым выглядзе накладаўся штраф у памеры ад 30 да 50 руб. П'яніц выхоўвалі на сходах працоўных калектываў, пазбаўлялі прэміі, так званай трынаццатай зарплаты, летняга адпачынку і нават чаргі на кватэру. Уцягненне ў п'янства непаўналетніх каралася пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў. Пасля з'яўлення ў 1986 г. у статуце КПСС патрабавання да пярвічных арганізацый змагацца за цвярозы лад жыцця камуністы былі вымушаны цалкам адмовіцца ад алкаголю. Усе без выключэння былі павінны ўступаць у таварыства барацьбы за цвярозасць. Партыйнага чалавека адразу звальнялі і выключалі з партыі за распіванне алкаголю на працоўным месцы. Знік такі від баўлення вольнага часу, як банкет: ні юбілей, ні абарона дысертацыі, ні прызначэнне на новую пасаду больш не былі годнай падставай для святкавання з ужываннем спіртнога. Паводле ініцыятывы жыхароў в. Вялікія Якаўчыцы Жабінкаўскага раёна п'яніц пачалі судзіць на сельскіх сходах. Асоб у нецвярозым стане больш не пускалі ў мінскае метро[13].

Вынікі першых арганізацыйных і адміністрацыйна-прававых захадаў па выкананні пастаўленай партыяй задачы красамоўна сведчылі пра тое, што

[7]НАРБ. Ф. 7. Воп. 11. Спр. 64. Арк. 18.
[8]Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб зацвярджэнні Палажэння аб камісіях па барацьбе з п'янствам, утвараемых на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях і іх структурных падраздзяленнях» // Збор законаў БССР, указаў Прэзідыума Вярхоўн. Савета БССР, пастаноў Савета Міністраў БССР. 1985. № 32. С. 523–535.
[9]НАРБ. Ф. 7. Воп. 11. Спр. 64. Арк. 19, 20, 71.
[10]Там жа. Арк. 70.
[11]Бой, который надо выиграть // Знамя юности. 1986. 6 июня. С. 1.
[12]*Павлючик Л.* Дело было вечером… // Там же. 1985. 15 авг. С. 1.
[13]*Сауткин И.* Пьяным в метро не место! // Там же. 28 мая. С. 4.

поспеху можна дасягнуць толькі пры планамернай, доўгатэрміновай працы. У верасні 1985 г. Камісія па барацьбе з п'янствам пры Савеце Міністраў БССР па ўзгадненні з ЦК КПБ даручыла АН БССР распрацаваць комплексную праграму прафілактыкі і пераадолення п'янства і алкагалізму ў рэспубліцы на 1986–2000 гг. У пачатку 1986 г. гэта даручэнне было выканана, і беларускае кіраўніцтва атрымала 50-старонкавы дакумент, падрыхтаваны спецыялістамі розных профіляў на чале з дырэктарам Інстытута філасофіі і права Я. М. Бабосавым. Аўтары праграмы звярнулі ўвагу найперш на антыалкагольнае выхаванне і прапаганду цвярозага ладу жыцця, стварэнне сістэмы сацыяльнага кантролю, а таксама на ажыццяўленне лячэбных і рэабілітацыйных захадаў у дачыненні да асоб, якія злоўжывалі спіртнымі напоямі[14].

У рэспубліцы пачалі праводзіцца безалкагольныя камсамольскія вяселлі. Адно з першых падобных вяселляў адбылося ў кастрычніку 1985 г. у Гродна, дзе пабраліся шлюбам каваль завода карданных валоў С. Круглікаў і загадчыца сектара ўліку камітэта камсамола таго ж завода В. Перапячай. Яго арганізатары імкнуліся замяніць алкаголь віктарынамі, конкурсамі і традыцыйнымі абрадамі. Аднак па словах спецыяльна запрошанага прадстаўніка маладзёжнай прэсы, «госці безалкагольнага вяселля збянтэжана аглядалі вясельны стол, не знаходзячы "галоўнага", без чаго, як гэта прынята лічыць, і вяселле не вяселле»[15].

Да прапаганды цвярозага ладу жыцця былі падключаны прафсаюзы, сістэма адукацыі і аховы здароўя, грамадскія арганізацыі і творчыя саюзы. Кінарэжысёр С. А. Гайдук зняў дакументальны фільм «Як у нас у Зарудзічах», драматург А. Л. Петрашкевіч напісаў п'есу «Ка-та-стро-фа», этнограф С. Ф. Цярохін апублікаваў кнігу пра тое, што ўжыванне алкаголю супярэчыць народным традыцыям [4]. Цэнзура бязлітасна выкрэслівала сцэны з алкаголем з тэкстаў літаратурных твораў і песень, знікалі адпаведныя эпізоды з фільмаў і тэатральных пастановак.

У 1988 г., калі на наркалагічным уліку ў БССР знаходзіліся 190,2 тыс. чалавек, шырокую вядомасць набыла дзейнасць урача-нарколага С. Л. Данской. Яна авалодала метадам экспрэс-стрэсатэрапіі, пасля чаго дамаглася адкрыцця ў мінскай паліклініцы № 16 гаспадарчаразліковага філіяла знакамітага наркалагічнага псіхатэрапеўтычнага цэнтра А. Р. Даўжэнкі. Лячэнне ў нарколага-наватара каштавала нятанна – 48 руб., аднак чарга да С. Л. Данской выбудавалася аж да 1991 г. Каля яе кабінета кожны дзень збіралася вялікая колькасць жадаючых пазбавіцца прыкрай заганы. Урач запрашала ў свой кабінет адразу па 30 пацыентаў і метадам унушэння (гіпнозу) кадзіравала алкаголікаў. За першы год працы С. Л. Данская вярнула да актыўнага жыцця каля 3 тыс. чалавек[16].

Пачынаючы з 1965 г. жыхары БССР, якія сістэматычна злоўжывалі спіртнымі напоямі і на гэтай глебе парушалі правілы сацыялістычнага агульнажыцця, накіроўваліся ў ЛПП для прымусовага лячэння і працоўнага перавыхавання тэрмінам ад 6 да 12 месяцаў. Тады ж у Светлагорску на базе папраўча-працоўнай калоніі агульнага рэжыму УЖ 15/3 была створана першая ўстанова падобнага тыпу. У адпаведнасці з планамі арганізатараў антыалкагольнай кампаніі на працягу 1986–1990 гг. колькасць ЛПП у рэспубліцы трэба было павялічыць, каб яны адначасова маглі прыняць 3 тыс. чалавек[17]. Акрамя таго, згодна з рашэннем Камісіі па барацьбе з п'янствам пры Савеце Міністраў БССР у 1985 г. аблвыканкамы выдзелілі памяшканні для стварэння выцвярэзнікаў у Баранавічах, Бабруйску, Барысаве, Ваўкавыску, Горках, Глыбокім, Жлобіне, Кобрыне, Лунінцы, Магілёве, Асіповічах, Ашмянах, Пінску і Слуцку[18].

Вынікі першых двух з паловай гадоў правядзення антыалкагольнай кампаніі падсумаваў намеснік міністра ўнутраных спраў БССР К. М. Платонаў: «У параўнанні з 1985 г. у 1987 г. колькасць прадпрыемстваў, якія вырабляюць вінна-гарэлачныя напоі, скарацілася ў 5,6 разу (з 146 да 26). За той жа час рэалізацыя спіртных напояў скарацілася ў два разы. З грамадзян, якія дапусцілі факты п'янства, спагнана амаль 4 млн руб. штрафаў, больш за 4 тыс. злосных парушальнікаў антыалкагольнага заканадаўства падвяргаліся адміністрацыйнаму арышту, 2,5 тыс. чалавек накіраваны на папраўчыя працы. З асоб, прыцягнутых да адміністрацыйнай адказнасці за выраб, захоўванне і набыццё самагону, спагнаны 1,2 млн руб. штрафаў. Каля 3 тыс. чалавек, якія злоўжывалі спіртным, народныя суды абмежавалі ў дзеяздольнасці, 4,1 тыс. чалавек накіраваны на лячэнне ад алкагалізму ў ЛПП. У выніку антыалкагольнай барацьбы страты працоўнага часу ў прамысловасці ў 1987 г., у параўнанні з 1985 г., скараціліся на 4 %, прагулы – на 25 %, колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, учыненых п'янымі кіроўцамі, скарацілася на 7,3 %»[19]. Пералічыўшы дасягненні, ён, як чалавек, які меў высокі міліцэйскі чын, прызнаў, што гэтыя вынікі з'яўляліся «ў асноўным следствам забарон і абмежаванняў, карэннага зруху ў свядомасці людзей не адбылося, п'янства скарачаецца марудна»[20].

[14]НАРБ. Ф. 7. Воп. 11. Спр. 58. Арк. 157–208.
[15]*Радивилов А.* Трезвая свадьба // Знамя юности. 1985. 10 окт. С. 2.
[16]*Захаранка А.* «Я п'яны ад цвярозага жыцця…» // Работніца і сялянка. 1988. № 6. С. 18–19.
[17]НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1081. Арк. 14.
[18]Там жа. Спр. 1093. Арк. 15.
[19]Там жа. Спр. 1508. Арк. 2.
[20]Там жа. Арк. 3.

## Беларускае рэспубліканскае добраахвотнае таварыства барацьбы за цвярозасць

Беларускае рэспубліканскае добраахвотнае таварыства барацьбы за цвярозасць было створана 16 кастрычніка 1985 г. у Мінску з мэтай мабілізацыі грамадства для ўдзелу ў антыалкагольнай кампаніі на ўстаноўчым сходзе. Яго старшынёй быў прызначаны віцэ-прэзідэнт АН БССР, вядомы фізіёлаг А. С. Дзмітрыеў. У склад рэспубліканскага савета ўвайшлі такія выбітныя асобы, як паэт Н. С. Гілевіч, скульптар А. А. Анікейчык, барэц А. В. Мядзведзь. На сходзе было абрана праўленне, а таксама быў прыняты статут, згодна з якім члены новай грамадскай арганізацыі абавязваліся не піць алкаголь ні пры якіх абставінах. Члены таварыства мелі пасведчанні і нагрудныя знакі адзінага ўзору. Працаўнікі плацілі ўступныя і штогадовыя ўзносы ў памеры 1 руб., студэнты, пенсіянеры і хатнія гаспадыні здавалі па 20 кап. Уся дзейнасць таварыства ажыццяўлялася на аснове самаакупнасці, бязвыплатнай грамадскай працы ўсіх членаў, за выключэннем пэўнай колькасці штатных работнікаў у Мінску, абласных і раённых цэнтрах.

На ўстаноўчым сходзе было вырашана стварыць структуру Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць паводле тэрытарыяльна-вытворчага прынцыпу. Яго падмуркам былі пярвічныя арганізацыі па месцы працы, вучобы, жыхарства членаў арганізацыі. Напрыклад, яны ўтвараліся на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, адміністрацыйных і навучальных установах, а таксама пры домакіраўніцтвах і інтэрнатах. Пярвічныя арганізацыі ствараліся пры наяўнасці не менш за 5 членаў таварыства. Структурнымі падраздзяленнямі пярвічак пры адпаведнай колькасці членаў маглі быць цэхавыя, брыгадныя, факультэцкія і іншыя арганізацыі, а таксама грамадскія клубы цвярозасці, якія дзейнічалі на базе навучальных і медыцынскіх устаноў, культасветустаноў. Пярвічныя арганізацыі аб'ядноўваліся ў абласныя, раённыя, гарадскія арганізацыі, якія, у сваю чаргу, уваходзілі ў склад Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць.

Кіруючым органам абласных, раённых і гарадскіх арганізацый таварыства барацьбы за цвярозасць лічыўся савет, які абіраўся на ўстаноўчай канферэнцыі, а выканаўчым органам – праўленне, у якое ўваходзілі старшыня, яго намеснік і члены гэтых арганізацый. Асноўны цяжар арганізацыйна-тэхнічнай працы ўскладаўся на вызваленага адказнага сакратара. У савет трэба было рэкамендаваць аўтарытэтных, вопытных, актыўных працаўнікоў, перадавых рабочых і калгаснікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі і грамадскіх арганізацый. На ўстаноўчых сходах па стварэнні пярвічных арганізацый у працоўных калектывах адкрытым галасаваннем абіраліся старшыня, сакратар і казначэй. Падрыхтоўка і правядзенне ўстаноўчых канферэнцый і сходаў, фарміраванне кіруючых органаў абласных, раённых і гарадскіх арганізацый таварыства ўскладаліся на выканкамы саветаў народных дэпутатаў сумесна з камсамолам, прафсаюзамі і органамі аховы здароўя[21].

Да канца 1985 г. была збудавана рэгіянальная структура Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць: паўсталі 6 абласных аб'яднанняў, 33 гарадскія і 142 раённыя арганізацыі, членамі якіх сталі больш за 6 тыс. чалавек. Акрамя таго, ішла праца па фарміраванні пярвічных арганізацый на прадпрыемствах. Па стане на 31 снежня 1985 г. налічвалася 3,757 тыс. такіх аб'яднанняў, у склад якіх увайшлі 59,526 тыс. «актыўных барацьбітоў за цвярозасць і здаровы быт»[22]. У структуры таварыства на вызваленых пасадах адказных сакратароў працавалі 260 чалавек[23].

Таварыства барацьбы за цвярозасць распачало дзейнасць у спрыяльных умовах, калі значная частка грамадства, у першую чаргу жанчыны і пенсіянеры, падтрымалі намер М. С. Гарбачова скончыць п'янства ў краіне. Так, у пачатку 1986 г. Бабруйская раённая арганізацыя таварыства, якая лічылася адной з лепшых у рэспубліцы, аб'ядноўвала 90 пярвічных арганізацый, створаных у дзяржаўных і вучэбных установах, а таксама на прамысловых прадпрыемствах і калгасах раёна. Усяго ў той час у раённай арганізацыі налічвалася 806 членаў, якія паводле сацыяльнай прыналежнасці падзяляліся на служачых (74,3 %), калгаснікаў (14,5 %), рабочых (10,3 %), навучэнцаў і студэнтаў (0,6 %). Разам з міліцыянерамі, урачамі, настаўнікамі і працаўнікамі культасветустаноў яны чыталі лекцыі, праводзілі размовы і арганізоўвалі дыспуты з мэтай выкрыць п'янства і алкагалізм. Былі вызначаны адзіныя дні антыалкагольнай прапаганды, а таксама з'явілася радыёгазета «Усё пачыналася з чаркі». У рэпертуар калектываў мастацкай самадзейнасці ўключаліся творы, у якіх прапагандаваўся цвярозы лад жыцця. Падчас уборкі ўраджаю ў полі выступаў створаны па ініцыятыве праўлення райсавета таварыства агітцягнік. Укараняліся новыя абрады: безалкагольныя вяселлі, радзіны, прысвячэнне юнакоў і дзяўчат у грамадзян СССР, праводзіны ў Савецкую армію. Тэрыторыя калгаса імя А. С. Пушкіна была абвешчана зонай суцэльнай цвярозасці[24].

Папулярнай формай работы таварыства былі клубы цвярозасці. На 1 студзеня 1987 г. у БССР налічва-

[21]НАРБ. Ф. 1171. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 8.
[22]Там жа. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 606. Арк. 11.
[23]Там жа.
[24]Там жа. Ф. 1171. Воп. 1. Спр. 13. Арк. 7.

лася 200 такіх клубаў. Іх удзельнікі займаліся не толькі асветніцкай працай, але і выступалі ініцыятарамі правядзення спартыўна-турыстычных мерапрыемстваў, безалкагольных вяселляў і г. д. Найбольшую вядомасць сярод гэтых устаноў атрымаў клуб цвярозасці «Паходня» пры Інстытуце цепла- і масаабмена АН БССР, створаны энтузіястам здаровага ладу жыцця малодшым навуковым супрацоўнікам В. М. Барыкіным. З'яўляючыся дэлегатам установчай канферэнцыі Усесаюзнага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць, ён усталяваў супрацоўніцтва з аднадумцамі з Кіева, Рыгі, Новасібірска і іншых гарадоў[25].

На III пленуме Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць, які адбыўся 12 верасня 1987 г., канстатавалася: колькасць членаў таварыства дасягнула 426 тыс. чалавек, яны аб'яднаны ў 16,6 тыс. пярвічных арганізацый, прадстаўнікі больш за 2 тыс. працоўных калектываў, інтэрнатаў і населеных пунктаў жывуць і працуюць па законах цвярозасці[26]. Старшыня пярвічнай арганізацыі Мінскай геолагаразведвальнай экспедыцыі А. А. Ганчарук рапартаваў пленуму: «Кантынгент нашай экспедыцыі вельмі складаны, шмат разведзеных, якія прызвычаіліся да самотнага ладу жыцця і, натуральна, выпівак. Супрацоўнікі партый 20 дзён у полі, 10 – у адгулах. Калі год таму значная колькасць супрацоўнікаў палявых партый з'яўлялася на працу ў нецвярозым стане, то цяпер гэта праблема цалкам вырашана»[27].

Разам з рапартамі, вытрыманымі ў духу казённага аптымізму, на пленуме прагучалі словы трывогі з нагоды негатыўных тэндэнцый у дзейнасці таварыства. У прыватнасці, выступоўцы адзначалі, што ў рэспубліцы пакуль не ўдалося стварыць шырокі фронт барацьбы з п'янствам, якое перамясцілася з публічнай прасторы ў сем'і, інтэрнаты. Назіраўся рост самагонаварэння, што не выклікала абурэння ў 37 % жанчын і 55 % мужчын, якія пражывалі ў рэспубліцы. Толькі 8 % працаздольных жыхароў дзяржавы ўдзельнічалі ў рабоце таварыства. Каля 25 % працоўных калектываў не мелі пярвічных арганізацый увогуле. Многія былі створаны паводле добраахвотна-прымусовага прынцыпу і, складаючыся пераважна з начальства і работнікаў, у ліку якіх было больш жанчын, працавалі фармальна. Дзясяткі членаў таварыстваў не пакінулі шкодных звычак[28].

Арганізаваная летам 1987 г. праверка пярвічнай арганізацыі БДУ, якая налічвала 2,826 тыс. чалавек і з'яўлялася адной з буйнейшых у БССР, паказала не толькі запазычанасць па ўнёсках, але і шматлікія статутныя парушэнні. Наглядная агітацыя была беднай, антыалкагольныя мерапрыемствы характарызаваліся фармальнасцю і нецікавасцю. Пра абвяшчэнне інтэрната № 6 зонай цвярозасці не ведалі яго насельнікі і нават камендант. Вынікі апытання, праведзенага ў тым жа годзе працаўнікамі Праблемнай навукова-даследчай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў БДУ, былі несуцяшальнымі. З яго вынікала, што каля 80 % студэнтаў і 70 % членаў мясцовай арганізацыі таварыства барацьбы за цвярозасць ужывалі алкагольныя напоі. Каля 80 % апытаных увогуле не адчувалі на сабе ўплыву таварыства, а каля 50 % рэспандэнтаў прапаноўвалі яго распусціць[29].

Апытанне, якое ў 1988 г. арганізавалі спецыялісты Рэспубліканскага сацыялагічнага цэнтра АН БССР, паказала, што толькі 14 % членаў Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць вялі цвярозы лад жыцця, 66 % удзельнікаў ужывалі алкаголь «культурна», 20 % чалавек злоўжывалі ім. Большасць рэспандэнтаў адзначылі, што ў рабоце таварыства шмат фармалізму, справаздачнасці, бюракратызму і мала карысных практычных спраў. Яго аўтарытэт сярод насельніцтва быў невысокім[30].

Партыйнае кіраўніцтва краіны са спазненнем прызнала наяўнасць сур'ёзных недахопаў у арганізацыі грамадства ў мэтах барацьбы з п'янствам і алкагалізмам. Пастанова «Аб перабудове работы Усесаюзнага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць» выйшла 26 кастрычніка 1988 г. у Маскве. У ёй вялася гаворка пра скарачэнне штатнага апарату таварыства, засяроджванне яго працы ў пярвічных арганізацыях з перадачай ім права распараджацца ўнёскамі, прыцягненне да барацьбы за цвярозы лад жыцця сапраўдных энтузіястаў, а таксама пра выкарыстанне новых форм працы, напрыклад рэабілітацыі алкаголікаў на кааператыўнай аснове[31].

Сакратарыят ЦК КПБ прадубліраваў названую вышэй пастанову 24 лістапада 1988 г., у адпаведнасці з якой апарат Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць быў скарочаны на 50 %, абласных арганізацый – на 32 %, раённых і гарадскіх арганізацый – на 9 %. Некаторыя арганізацыі таварыства сталі працаваць выключна на грамадскіх пачатках. Сацыяльную адаптацыю хворых на алкагалізм распачаў кааператыў «Надзея»,

[25] *Белоус А.* Свети, «Факел»! // Знамя юности. 1986. 4 февр. С. 2.
[26] НАРБ. Ф. 1171. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 38, 53.
[27] Там жа. Арк. 3.
[28] *Левин В., Осинский И.* Бумажный синдром. Заметки с пленума республиканского совета Белорусского добровольного общества борьбы за трезвость // Знамя юности. 1987. 16 сент. С. 1.
[29] НАРБ. Ф. 1171. Воп. 1. Спр. 24. Арк. 6–9.
[30] Там жа. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 2342. Арк. 23.
[31] Постановление секретариата ЦК КПСС «О перестройке работы Всесоюзного добровольного общества борьбы за трезвость» // Изв. ЦК КПСС. 1989. № 9. С. 21–24.

створаны пры мінскай гарадской арганізацыі. У савет таварыства ўключылі протаіерэя М. М. Уляхіна, адначасова яно распачало супрацоўніцтва з Саюзам фінскіх цвярозніцкіх арганізацый. Абвешчанае ў кастрычніку 1990 г. перайменаванне Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць у Беларускае рэспубліканскае добраахвотнае таварыства «Цвярозасць» сведчыла пра намер яго кіраўніцтва пазбавіцца традыцый ваяўнічага атэізму[32].

Неабходна адзначыць, што ўсе захады не маглі пераламаць агульную тэндэнцыю згасання дзейнасці таварыства. На працягу 1988 г. перасталі працаваць 186 пярвічных арганізацый дадзенага таварыства, а колькасць яго членаў скарацілася на 14,204 тыс. чалавек. У 1989 г. гэта тэндэнцыя толькі набірала моц: пярвічных арганізацый стала менш на 2,67 тыс. аб'яднанняў, членаў таварыства – на 106,951 тыс. чалавек. Паўсталі цяжкасці з фінансаваннем антыалкагольных мерапрыемстваў.

Выступаючы на справаздачна-выбарнай канферэнцыі ў кастрычніку 1990 г., намеснік старшыні рэспубліканскага савета Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства «Цвярозасць» Р. С. Шылава канстатавала: «Цвярозніцкі рух апынуўся сёння ў крытычным стане. 58 % насельніцтва не верацьу магчымасць пераадолення п'янства. Высакароднай мэты мы хацелі дасягнуць у рэчышчы і метадамі камандна-адміністрацыйнай сістэмы, да гэтага можна дадаць валюнтарызм – імкненне скончыць з векавымі традыцыямі за некалькі гадоў. Кампанія была пабудавана ў значнай ступені на прымусе, а не на праве свабоднага выбару. Масавага руху так і не было створана. Наша таварыства не здолела праявіць сябе дастаткова прывабна»[33].

На момант распаду СССР у шэрагах Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства «Цвярозасць» налічвалася 136,76 тыс. членаў, аб'яднаных у 7,43 тыс. пярвічных арганізацый[34]. Большасць з іх былі «папяровымі» і зусім не бралі ўдзел у змаганні з «зялёным змеем». Пасля зняцця абмежаванняў на продаж алкагольных вырабаў да прапаганды здаровага ладу згубіла цікавасць і ўлада. Так, у красавіку 1991 г. намеснік старшыні Савета Міністраў БССР М. У. Мясніковіч на прапанову старшыні Усесаюзнага добраахвотнага таварыства цвярозасці М. Ц. Трубіліна стварыць у Мінску фонд цвярозасці адказаў: «…у сувязі са складанай эканамічнай сітуацыяй утварэнне яго ў бягучы час не ўяўляецца магчымым»[35].

У апісаных вышэй умовах у БССР з'явіліся эмісары Амерыканскага таварыства ананімных алкаголікаў, якія на бязвыплатнай аснове прапаноўвалі праграму духоўнай пераарыентацыі для залежных ад алкаголю людзей пад назвай «12 крокаў». Далучыцца да іх групы мог кожны жадаючы праз тэлефонны званок. Першы сход ананімных алкаголікаў у Мінску правёў нейкі Ліа К. у маі 1990 г.[36]

## Нечаканыя наступствы

Рашэнне «ацвярэзіць» рэспубліку, прынятае без належнай сацыяльнай і эканамічнай прапрацоўкі і ўліку псіхалогіі спажыўцоў, прывяло айчынную спіртагарэлачную і вінаробную прамысловасць да цяжкага становішча. На працягу другой паловы 1985 – 1986 гг. 12 спіртавых заводаў скарацілі вытворчасць спірту на 58,0 %, 5 лікёра-гарэлачных заводаў пачалі выпрацоўваць на 63,7 % менш лікёра-гарэлачных напояў, 12 вінаробных заводаў зменшылі аб'ём вырабу вінаградных він на 75,0 % і пладова-ягадных він на 53,0 %[37]. Лікёра-гарэлачныя заводы пераабсталяваліся ў прадпрыемствы па выпуску безалкагольных напояў паўсюдна. Усе 13 саўгасаў рэспублікі, якія выраблялі яблычныя віны, перайшлі на вытворчасць яблычных сокаў[38].

Раздражненне насельніцтва выклікалі эксперыменты з рэалізацыяй піва, выраб якога таксама рэзка скараціўся. З пачаткам кампаніі піўныя бары, як і іншыя месцы продажу алкагольных напояў, паўсюдна зачыніліся. Праз пэўны час піва, як і сухое віно, было аднесена да слабаалкагольных напояў, якія савецкім людзям было дазволена спажываць «культурна». Неўзабаве ўлада вырашыла, што канцэнтрацыя вялікай колькасці не зусім цвярозых мужчын з келіхамі ў руках унутры і, галоўнае, каля піўных «шкляшак»[39] дае непатрэбны прыклад, і піва пачалі прадаваць у тары пакупнікоў. Гэта мера была прынята для таго, каб людзі пілі ва ўсіх месцах, акрамя публічных[40].

Паўсюдна квітнелі крадзеж і спекуляцыя алкаголем. У параўнанні з 1985 г. у 1986 г. колькасць крадзяжоў на спіртавых, лікёра-гарэлачных і вінаробных заводах павялічылася на 53 %[41]. У Мінску і абласных цэнтрах можна было купіць гарэлку без чаргі

[32]НАРБ. Ф. 1171. Воп. 1. Спр. 38. Арк. 3.
[33]Там жа. Спр. 41. Арк. 9.
[34]Там жа. Спр. 52. Арк. 2.
[35]Там жа. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 2525. Арк. 242.
[36]*Рабушко А.* Хотите бросить пить? // Знамя юности. 1990. 15 мая. С. 4.
[37]НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1080. Арк. 2.
[38]Айдарэт і іншыя // Беларусь. 1986. № 2. С. 3.
[39]Пераклад рускага размоўнага слова «стекляшка», якое ў дадзеным кантэксце абазначае сезоннае кафэ.
[40]*Владимиров П.* Благоглупости // Знамя юности. 1989. 29 янв. С. 4.
[41]НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1080. Арк. 2.

і ў любы час сутак у таксістаў, але па вельмі высокай цане (20–25 руб. за бутэльку). Па спекуляцыйнай цане прадавалі гарэлку на вынас у некаторых рэстаранах і падпольных кропках. У канцы 1986 г. у рэдакцыю газеты «Советская Белоруссия» паскардзіліся людзі, якія пражывалі ў Барысаве па вул. Працы ў д. 26: «У нашым доме многія прадаюць гарэлку, віно і самагон. Бутэлька гарэлкі каштуе 15 руб., віна – 5 руб., самагону – 6 руб. Гандаль ідзе кругласутачна, ім займаюцца ў асноўным тыя, хто не працуе. Напрыклад, у кватэрах № 2, 5, 10, 11, 19, 39. У суседнім доме падпольны гандаль спіртным ідзе ў яшчэ больш прамысловых памерах… Міліцыя ніяк на месцы злачынства ўзяць іх не можа, а калі казаць шчыра, то некаторыя нядобрасумленныя супрацоўнікі міліцыі разам з гандлярамі п'юць, таму няма каму скардзіцца. Вялікая ў нас просьба, дапамажыце нам, паглядзіце на матчыны і дзіцячыя слёзы… Свае імёны мы пісаць не будзем, бо баімся помсты»[42].

За дзевяць месяцаў 1986 г. за парушэнне правіл гандлю спіртнымі напоямі былі прыцягнуты да адказнасці 1,15 тыс. работнікаў Міністэрства гандлю БССР і Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў. Асобныя райвыканкамы прынялі рашэнне ўвесці талонную сістэму на продаж алкаголю. Напрыклад, у 1986 г. жыхары Глыбоцкага раёна маглі па адным талоне набыць 15 бутэлек гарэлкі на месяц[43].

Распаўсюдзілася такая з'ява, як самагонаварэнне, пра што сведчылі рэзкае павелічэнне продажу цукру і ў далейшым узнікненне яго дэфіцыту. У непралазных лясах калгаснікі, якім часта дапамагалі леснікі, займаліся абсталяваннем бровараў, дзе выраблялі самагон у прамысловых маштабах. Па словах міністра ўнутраных спраў В. А. Піскарова, самагонаварэнне з'яўлялася найбольш вострай праблемай для яго ведамства. Калі ў 1985 г. былі прыцягнуты да адказнасці 4,2 тыс. самагоншчыкаў, то ў 1987 г. іх колькасць дасягнула ўжо 13,7 тыс. чалавек, а ў 1988 г. – 24,6 тыс. чалавек. Жанчыны (пераважна сталага веку) складалі 72,7 % асуджаных за самагонаварэнне. Яны бралі на сябе ўсю адказнасць, бо ведалі, што суд улічыць іх узрост і сямейныя абавязкі. Так, у 1986 г. Дзятлаўскі народны суд прыцягнуў да адказнасці за падпольны выраб алкаголю 102-гадовую грамадзянку Шапель, а Мазырскі народны суд – 70-гадовую невідушчую грамадзянку Голік, якія «з прычыны сваёй фізічнай нямогласці не маглі абысціся без памагатых»[44].

Павялічылася колькасць грамадзян, якія выраблялі самагон выключна на продаж. У 1988 г. з іх быў спагнаны штраф у памеры 2,4 млн руб.[45] Тады ж міліцыя адабрала ў насельніцтва 5,7 тыс. самагонных апаратаў, 348 тыс. т брагі, 27 тыс. л самагону. Новай з'явай стала самагонаварэнне ў буйных гарадах: толькі ў Мінску ў 1988 г. за гэту дзейнасць былі прыцягнуты да адказнасці звыш 2 тыс. чалавек[46]. Павелічэнне ў чэрвені 1987 г. штрафаў за выраб, захаванне і збыт самагону з 300 да 500 руб., за выраб без мэты збыту з 100 да 300 руб. і за набыццё самагону з 30 да 100 руб. не спыніла ні вытворцаў, ні спажыўцоў забароненага напою[47].

Ва ўмовах рэзкага скарачэння продажу алкагольных напояў узрасло спажыванне сурагатаў алкаголю: адэкалону, ласьёну, сродку для чысткі шкла, дэнатурату, антыфрызу. Падобныя сурагаты вольна прадаваліся ў гаспадарчых і прамтаварных крамах, аптэках на працягу ўсяго дня і былі даступнымі для асоб да 21 года. У параўнанні з 1984 г. у 1985 г. прадпрыемствы Міністэрства гандлю БССР рэалізавалі на 4,3 % больш адэкалону, на 5,3 % больш ласьёну і духмянай вады, а таксама на 6,2 % больш вадкасці для чысткі шкла. Грамадзянам былі прададзены 32 т антыфрызу і 67 т дэнатурату (у 1984 г. яны пастаўляліся толькі прадпрыемствам і арганізацыям). У 1986 г. Беларускі рэспубліканскі саюз спажывецкіх таварыстваў прадаў 248 т антыфрызу, 20 т дэнатурату, 37 т сродкаў для чысткі шкла, а за продаж парфумных тавараў, якія замяшчалі спірт, ён атрымаў 5,3 млн руб. Вынікам ужывання сурагатаў было павелічэнне выпадкаў атручвання. Па дадзеных Міністэрства аховы здароўя БССР, пры скарачэнні колькасці смерцей грамадзян ад злоўжывання алкаголем з 1,486 тыс. чалавек у 1984 г. да 1,168 тыс. чалавек у 1985 г. (на 21,4 %) колькасць атручванняў вадкасцямі, якія замяшчалі спірт, павялічылася з 74 да 102 выпадкаў (на 37,8 %)[48].

Дзяржава імкнулася абмежаваць продаж сурагатаў алкаголю. З 1986 г. спірт і выраблены на яго аснове лекі прадаваліся толькі па рэцэптах урачоў, а таксамі былі абмежаваны нормы водпуску падобных прэпаратаў, якія прадаваліся без рэцэптаў. Грамадзяне маглі набыць антыфрыз толькі пасля прад'яўлення праў кіроўцы і тэхпашпарта аўтамабіля. Быў узмоцнены кантроль за продажам дражджэй. Аднак дадзеныя меры не спынялі тых, хто жыў паводле правіла «п'ём усё, што гарыць». Так, на Бабруйскім гідролізным заводзе рамонтнікі, прасвідраваўшы трубаправод у гідролізнаспіртавым цэху, набралі метылавага спірту, які па паху і знешняму выгляду быў падобны на этылавы спірт. Вынікам яго спажывання сталі 10 смерцей і 40 цяжкіх атручванняў[49].

[42]НАРБ. Ф. 239. Воп. 5. Спр. 48. Арк. 6–7.
[43]Там жа. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 607. Арк. 51–52.
[44]Там жа. Спр. 608. Арк. 37.
[45]*Новікаў Д.* Закон і сумленне // Звязда. 1988. 18 жн. С. 2.
[46]НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1933. Арк. 6.
[47]Там жа. Спр. 1081. Арк. 208–211.
[48]Там жа. Спр. 605. Арк. 69.
[49]*Віктараў М.* Трагічнае пахмелле // Звязда. 1990. 7 чэрв. С. 3.

Абвастрылася сітуацыя ў 8 беларускіх ЛПП, дзе ўмовы прымусовага лячэння 6 тыс. алкаголікаў няшмат адрозніваліся ад умоў адбывання пакарання ў папраўча-працоўных калоніях, што парушала іх канстытуцыйныя правы і свабоды. У ЛПП большасць абмежаванняў не выклікаліся неабходнасцю лячэння, людзі вызваляліся адтуль не па медыцынскіх паказаннях, а па заканчэнні тэрміну, вызначанага судом. Эфектыўнасць тэрапіі ў ЛПП была невысокай, і большасць пацыентаў пасля вызвалення вярталіся да папярэдняга ладу жыцця. Увесну – летам 1990 г. у ЛПП, якія знаходзіліся ў Светлагорску, Віцебску, Магілёве і Гомелі, адбыліся масавыя выступленні алкаголікаў, патрабаваўшых гуманізацыі рэжыму, а менавіта дазволу адпачынкаў, спатканняў са сваякамі, атрымання пасылак ад іх і г. д.[50] Пайшоўшы насустрач гэтым патрабаванням, у жніўні 1990 г. улада вызваліла ад прымусовага лячэння жанчын[51]. Аднак прынятым 21 чэрвеня 1991 г. законам беларускія парламентарыі захавалі ЛПП як інстытут, абмежаваўшы дзеянне закона аб прымусовай працоўнай тэрапіі толькі ў адносінах алкаголікаў і наркаманаў, якія парушалі грамадскі парадак і правы іншых асоб[52].

Большасць савецкіх людзей успрынялі гарбачоўскую антыалкагольную кампанію як абсурдную ініцыятыву, накіраваную супраць простага народу. Апытанне, праведзенае спецыялістамі Рэспубліканскага сацыялагічнага цэнтра АН БССР, паказала, што ў 1988 г. цвярозы лад жыцця вялі толькі 16 % прадстаўнікоў дарослага насельніцтва БССР, 48 % жыхароў дзяржавы ўжывалі алкагольныя напоі ўмерана, 30 % чалавек злоўжывалі імі, а 6 % людзей з'яўляліся хворымі на алкагалізм. Неабходна адзначыць, што ў 68 % насельніцтва пераважала арыентацыя на ўжыванне моцных напояў[53]. У 1988 г. 350 тыс. жыхароў БССР былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за п'янства[54]. Не выклікала ў насельніцтва добрых пачуццяў увядзенне ў 1989 г. талонаў на алкаголь, па якіх можна было атрымаць толькі 2 бутэлькі моцнага алкаголю, напрыклад гарэлкі і каньяку, і 2 бутэлькі віна на месяц. Варта ўказаць, што летам 1990 г. гэта норма скарацілася ў два разы[55]. Напярэдадні 1989 г. у вялікім дэфіцыце было шампанскае. За гэтым алкагольным напоем выбудоўваліся доўгія чэргі[56].

Формы і метады правядзення кампаніі выклікалі раздражненне ў моладзі. Навучэнец Маладзечанскага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча Антон Ш. пісаў у маладзёжную газету ў верасні 1988 г.: «Калі казаць шчыра, то ўсе гэтыя захады па барацьбе з алкагалізмам нічога істотнага не далі. Які сэнс у тым, што падвысілі кошт спіртных напояў? Хіба дабіліся зніжэння спажывання алкаголю? Не! Піць сталі нават больш, і прытым розную дрэнь, напрыклад дэнатураты, дэзадаранты. Амаль усю парфумерыю выпілі!.. Ну а якое вяселле без спіртнога? Вось нядаўна паказвалі безалкагольнае вяселле з гарбатай і пернікамі. Я бачыў твары запрошаных на гэту сямейную імпрэзу. Пахмурныя, сумныя, толькі для паказухі ў камеру ўсміхаюцца… Калі па праўдзе, то мне падаецца, што пілі, п'юць і будуць піць»[57].

М. С. Гарбачоў прызнаў правал антыалкагольнай кампаніі неахвотна, пад ціскам свайго атачэння. Тагачасны кіраўнік савецкага ўрада М. І. Рыжкоў згадваў, як 8 верасня 1988 г. на пасяджэнні Палітбюро ЦК КПСС ён патрабаваў спыніць кампанію, спасылаючыся на тое, што людзям і эканоміцы нанесена вялікая шкода. Яго падтрымалі многія прысутныя, у тым ліку нядаўна пераведзены з Мінска ў Маскву М. М. Слюнькоў. Генеральны сакратар быў вымушаны падтрымаць думку большасці[58].

Фармальна кіраўніцтва СССР не спыняла антыалкагольную кампанію. Тым не менш пад уплывам бюджэтнага дэфіцыту і грамадскага незадавальнення пачалося яе павольнае згортванне. Савет Міністраў СССР адмяніў усе абмежаванні на продаж алкаголю 24 ліпеня 1990 г. Паступова адбывалася аднаўленне работы вінна-гарэлачных заводаў і крам, у выніку чаго ў 1991 г. спажыванне спіртнога выйшла на ўзровень 1984 г. Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі пра барацьбу за здаровы лад жыцця ўжо не згадвалі, а айчынны рынак запоўніла танная, няякасная алкагольная прадукцыя.

## Заключэнне

У кароткатэрміновай перспектыве савецкая антыалкагольная кампанія другой паловы 1980-х гг. мела шэраг станоўчых вынікаў. Адбылося зніжэнне смяротнасці. Павялічылася прадукцыйнасць працы, скарацілася колькасць прагулаў. Зменшыўся паказчык злачынстваў, здзейсненых на глебе п'янства. Спажыванне спіртнога стала больш рацыянальным. Умацавалася сям'я, жанчыны пачалі больш нараджаць.

---

[50]НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 1509. Арк. 141.
[51]Там жа. Спр. 2521. Арк. 8.
[52]Закон «Аб мерах прымусовага ўздзеяння ў адносінах хранічных алкаголікаў і наркаманаў, якія сістэматычна парушаюць грамадскі парадак або правы іншых асоб» // Ведамасці Вярхоўн. Савета Беларус. ССР. 1991. № 23. С. 12–15.
[53]НАРБ. Ф. 7. Воп. 10. Спр. 2342. Арк. 10, 12.
[54]*Лапін В.* І несакрэтнае – сакрэтна // Беларусь. 1989. № 9. С. 6–7.
[55]*Котов В.* Очереди растаяли, однако… // Знамя юности. 1990. 11 июля. С. 4.
[56]*Бандарчык Л.* Іскры ў святочных бакалах // Чырвон. змена. 1988. 31 снеж. С. 3.
[57]*Антон Ш.* Свадьба – без рюмки?! // Знамя юности. 1988. 25 сент. С. 3.
[58]*Рыжков Н. И.* Десять лет великих потрясений. М. : Книга. Просвещение. Милосердие, 1995. С. 100.

Насуперак абвешчаным М. С. Гарбачовым пераходу на новыя метады кіравання і барацьбе з бюракратызмам, антыалкагольная кампанія праводзілася ранейшымі, прымусова-адміністрацыйнымі метадамі. У яе арганізатараў не было дакладнага ўяўлення пра спосабы прасоўвання да заяўленых мэт, а для большасці работнікаў партыйнага апарату істотнымі былі толькі справаздачныя паказчыкі. Кампанія не прадугледжвала правядзення працяглай і сістэматычнай працы, накіраванай на папулярызацыю здаровага ладу жыцця і фарміраванне негатыўнага стаўлення да алкаголю ў савецкіх грамадзян.

Нягледзячы на пэўныя станоўчыя з’явы, змаганне з народнай бядой сустрэла непаразуменне і супраціўленне значнай часткі беларускага грамадства. У рэспубліцы павялічыліся аб’ёмы самагонаварэння, а таксама ўжывання алкагольных сурагатаў, што было формамі кампенсацыі скарачэння продажу спіртнога. Ва ўмовах галоснасці чэргі за алкагольнымі вырабамі пераўтвараліся ў дэманстрацыі, у ходзе якіх даставалася ўсім: і партыі, і ўраду, і дэпутатам. Кожная чарга несла ў сабе вялікую колькасць адмоўных эмоцый, якія і без таго перапаўнялі людзей. Яны адгукнуліся на абмежавальныя і выхавальніцкія захады ўлады жартамі і афарызмамі накшталт «Безалкагольнае вяселле – першы крок да бязгрэшнага зачацця», пачалі называць М. С. Гарбачова мінеральным сакратаром. У канцы 1980-х гг. антыалкагольная кампанія пераўтварылася ў фарс.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Нестерович НБ. Наша боль – алкоголь. *Беларуская думка*. 2007;10:117–122.
2. Боброва АГ. Политика в области профилактики и предупреждения пьянства и алкоголизма в Беларуси. *Беларуская думка*. 2019;1:74–81.
3. Кривонос ЛМ. Острые грани граненого стакана. *Беларуская думка*. 2019;8:44–51.
4. Цярохін СФ. *У фокусе канкрэтнага факта: праўда і мана пра ап’яняльныя напіткі*. Мінск: Навука і тэхніка; 1988. 157 с.

*Атрымана 22.12.2024 / выпраўлена 02.07.2025 / прынята 02.07.2025.*
*Received 22.12.2024 / revised 02.07.2025 / accepted 02.07.2025.*